# Ogłoszenia parafialne

## II Нядзеля Адвэнту 2020

*5 grudnia 2020*

## Аб’явы

## на нядзелю 6 XII 2020

1. Рараты у панядзелак, сераду і пятніцу а 6.45.
2. У аўторак Урачыстасць Беззаганнага зачацця НПМ
3. У кожную нядзелю Адвэнту запрашаю ў 10.45 на абрад святла.
4. У наступную нядзелю ў 14.30 малітва супольнасці Апостальства дапамогі душам чысцовым.
5. **У гэтым годзе не будзе рэкалекцый у Адвэнце. Перад святамі Божага Нараджэння будзе вызначаны дзень св. Споведзі.**
6. Запрашаем прыняць удзел у конкурсе малюнкаў, і Сямейных стаенак на Божае нараджэнне. Стаенку сям’я можа зрабіць паводле ўласнага праекта і метада. Важна, каб у працы была задзейнічана ўся сям’я. Зробленую стаенку і малюнкі трэба прынесці ў капліцу да 24 снежня 2020 г.
7. Пасля святаў Божага Нараджэння згодна з традыцыяй адбываюцца душпастырскія візіты (каляда). Святары ў гэты час наведваюць сем’і. Сёлета эпідэмія зрабіла немагчымымі такія адведзіны і калядныя спатканні. Вірус хваробы пераносіцца і заражае чарговых асобаў падчас адведзінаў і спатканняў. Таму з клопатам пра бяспеку і здароўе сёлетняя каляда будзе адбывацца наступным чынам:

У вызначаны дзень і аб узгодненай гадзіне жыхары вёскі, вуліцы ці паасобнага жыллёвага дому, якія жадаюць прыняць каляду, збіраюцца ў акрэсленым месцы звонку. Калі паблізу (нр. у вёсцы, на вуліцы) ёсць крыж, то каля яго мы падрыхтоўваем накрыты белым абрусом стол з запаленымі свечкамі.

Асоба адказная за дадзены раён падрыхтоўвае спіс сем’яў, якія жадаюць прыняць удзел у малітве. Гэты спіс патрэбны, каб святар змог аднатаваць факт прыняцця каляды 2021 г. у парафіяльнай картатэцы. Асобы, якія не могуць выйсці з дому, таксама паведамляюць аб жаданні прыняць каляду і ў часе малітвы духоўна злучаюцца з іншымі ўдзельнікамі супольнай малітвы.

За ўдзельнікаў і жыхароў кожны дзень калядных адведзінаў будзе цэлебравацца Св. Імша.

Ахвяры, складзеныя ў гэты дзень, будуць прызначаны на будову даху касцёла.

8. У сувязі з увядзеннем абавязку нашэння масак іх трэба таксама ўжываць у часе малітвы ў капліцы.

9. Пасля св. Імшы на выхадзе з капліцы можна купіць аплатак на вігілійны стол за дабравольную ахвяру і насценны каляндар на 2021 год. Кошт 5 р. і 6 р.

10. Дзякую за складзеныя ахвяры на патрэбы касцёла.